# ВЫДРА БЕЛАРУСКАЯ

Выданьне Рады Беларускай суполкі у Чэхіі «Скарына»

**N3, травень 2005**


# КРУМЛАЎСКАЯ КАЗКА

*З 22 сакавіка па 18 красавіка ў Чэхіі па запрашэньню суполкі «Скарына» знаходзіўся вядомы беларускі мастак і пэрформэр сп-р Алесь Пушкін, які большасьць часу працаваў над сваімі мастацкімі творамі ў Чэскім Крумлаве – сярэдневечным горадзе Паўднёвай Чэхіі, які цалкам узяты пад абарону ЮНЭСКА , бо горад фактычна не зьмяніўся з сярэдзіны 18 стагоддзя і ўяўляе сабой найкаларытнейшае мейсца ва ўсёй Эўропе. 16 красавіка суполка “Скарына” правяла выставу твораў А.Пушкіна ў Празе, на якой пабыло больш за паўсотню беларусаў. На разьвітанне мастак гаварыў аб сваіх уражаннях.*

На гэты раз вясновае маё перабываньне ў Чэхіі пачалося са сьвята 25 Сакавіка – Дня Незалежнасьці Рэспублікі Беларусь, 87-х угодкаў. Прыехаў я па запрашэньню Рады суполкі «Скарына», падпісанаму спадаром Юркам Станкевічам, і ўбачыў на уласныя вочы сёлетнее сьвяткаваньне беларусаў, якія жывуць у Чэхіі, свайго Найгалоўнейшага сьвята – Дня абвешчаньня БНР. Я намагуся быць аб'ектыўным, бо прысутнічаў 25 сакавіка й на сустрэчы з сэнатарамі ў Сэнаце ЧР (з раніцы, у 11.30, мерапрыемства, арганізаванае Зьвязам беларусаў замежжа), і ў Люстраной Залі назаўтра, арганізаванай суполкай «Скарына», й на канцэрце бардаў Сваталлука Караска й Віктара Шалкевіча 26 сакавіка ў Паэтыцкай гасподы, арганізаваным чэскай фундацыяй «Чалавек у нядолі». Да гэтага ж, 25 сакавіка, з суполкай «Скарына» мы наведалі Альшанскія могілкі, магілы Пётры Крэчэўскага і Васіля Захаркі.

Асноўная думка: як аб'яднаць усіх гэтых людзей, што душой шчыра любяць Беларусь – сваю Радзіму – й жадаюць ёй дабра й шчасьлівай будучыні? Магчама, шлях ляжыць праз шчырыя маленькія зьдзяйсьненьні дзеля канкрэтных людзей нашай Бацькаўшчыны – а тым самым ёй усёй («Ссытачак Добрых Справаў»).



## Культура

Дадзены прыезд – гэта самотная, ціхая праца ў сярэдневечным горадку Чэскім Крумлаве. Гэта ранішнія вандроўкі па векавому замкаваму парку, дзе ў тумане як быццам праходзілі дзяўчыны й дамы, вядзьмаркі і алхімікі, прыдворныя мастакі й архітэктары, й чыстая Белая Панна са сваімі трыма парамі пяльчатак, каму які падаючы знак: чырвоныя – пажар, чорныя – сьмерць, белыя – дабро.

Першы тыдзень даўся цяжка. Чаму? – Сны не давалі пакою. Перасьніліся ўсе – тата, жонка, мама пакойная… І толькі пасьля першага тыдня, калі даведаўся, што пайшоў мой сынок па падворку ў Бабры, мне стала хораша. І справа пайшла!

Я удзячны лёсу, што адбылося малое цуда – узьнік шанец у жыцці пажыць у сярэдневечным горадзе. Пад вокнамі – Влтава, пісаліся карціны, пад вечар хораша сьпявалі птушкі, калі я самотна гуляў па замкавым падвор'і. І верылася, што гэтая творчая энэргтя ня можа бясследна зьнікнуць, што душы мясцовых беларусаў і тых, каго пабачу дома, - пераменяцца. І гэты цуд я ўбачыў у вачах зусім розных і нецярплівых асоб, якія прыйшлі на маю выставу, якую зарганізавала суполка «Скарына» у Празе 16 красавіка па вул. Jana Zajice, 36. Гэта была маленькая перамога чысьціні, прыгажосьці і культуры ў складаным, пыхлівым, амбітным гэтым сьвеце, дзе няма галодных і прыніжаных, а ёсьць бязвер'е й нелюбоў да бліжняга. Вось мой шлях. І мая роля культурных прыездаў да сяброў-эмігрантаў: рабі як я, і ў гэтым будзе плён.

## Сьмерць Папы Рымскага, якая мяне засьцігла ў Чэскім Крумлаве

Такая падзея, якую нельга не адзначыць, бо сам прычыніўся да напісання яго выявы на суфіце капліцы Св. Язэпа Магілёўскай Катэдры ў 1995 – 1996 гг.

Маральныя аўтарытэты для мяне выходзяць у сьвет іншы: Васіль Быкаў, Папа… І з трывогай чакаю заўтрашняга дня касьцёла, ягонай моўнай палітыкі на Беларусі, духоўнасьці й кананічнасьці, бо Папа быў тым гарантам, што Хрыстовы карабель касьцёла йдзе верным шляхам. Сьведчаньне таму – ягоныя асбістыя падзей жыцьця, як ён іх асабіста перажыў…

***працяг на старонцы 2***

Замак у Чэскім Крумлаве быў заснаваны ў 13 ст. родам Віткаўцоў; пасьля 1302 г., калі род Віткаўцоў перапыніў сваё існаванне, Чэскі Крумлаў зрабіўся асноўнай рэзідэнцыяй рода Рожмберкаў, на гербе якіх была намалявана чырвоная ружа з пяцью ляпёсткамі. З 1602 г. горад перайшоў пад уплыў аўстрыйскіх родаў Эггенбергаў і Шварцэнбергаў, некаторы час належаў імпэратару Рудольфу ІІ.
С замкам звязана легенда аб Маркеце Піхлеравай – простай дзяўчыне, у якую закахаўся звар'яцелы сын імператара Рудольфа Юлій Д'Аўстрый. Апошняга бацька пасяліў ва Крумлаўскім замку. У прыпадку шаленства Юлій Д'Аўстрый забіў сваю каханую. Па загаду імператара яго арыштавалі і затачылі у некалькіх пакоях замка, пасьля чаго ён неўзабаве памёр. А прывід Маркеты, згодна легендзе, да нашых дзён час ад часу з'яўляецца ў замку.





# КРУМЛАЎСКАЯ КАЗКА

*працяг са старонкі 1*

## Натхненне

Як заўсёды, лепшая задумка прыходзіць пад канец прэбываньня ў Чэскім Крумлаве – «Крумлаўская казка»: лілёвы прыцемак вечара, захад сонца над замкавай сажалкай, чорныя вузлавыя дубы-чараўнікі, нізка да вады схіленыя галіны з птушкамі й ржавай пазалеташняй лістотай і Панна, якая адлюстроўваецца ў ціхіх водах Сажалкі-горада; горад асьвятляецца ціхім цёплым сьветам запаліўшыхся агеньчыкаў шматлікіх гаспадак, пэнсіёнаў, гатэляў і дамоў. Легенда-сучаснасьць.

З нейздзейсьненымі задумамі я прыязджаю 16 красавіка ў Прагу. Прага па-вясноваму бадзёрая, цёплая. Паўсюдна квітнеючыя сады, магноліі й акацыі. Прага – гэта нейздзейсьненая беларуская мара з яе ўтульнасьцю, старасьвецкасьцю й даглежанасьцю помнікаў архітэктуры й гісторыі, ператварыўшымі яе ў асноўны нацыянальны здабытак.

Хацелася б яшчэ адзначыць наведванне замка ў Глыбокім – рамантычнага, сьветлага замка, найлепшага, на маю думку, замка ў Чэхіі. Мы былі там у нядзелю 17 красавіка з сям'ёй Скарулісаў. Атрымалі шмат станоўчых эмоцыяў, зрабілі маленькае сьвята перад развітаннем з блізкім мне чалавекам – Сяргеем Скарулісам, дзякуючы якому я ўпэўнены ў адным: хочацца жыць доўга, сябраваць і абавязкова яшчэ вяртацца ў Чэхію з гасьцінцамі й творчымі задумкамі, навінамі, кнігамі, добрымі намерамі.

*Гутарыла Іна Паўловіч, старшыня суполкі Скарына*

# НАВІНЫ, АБ'ЯВЫ

## КАНФЛІКТ ВЫРАШЫМ У СУДЗЕ

18 студзеня спадар Сяргей Скаруліс, сябра Рады суполкі «Скарына», падаў судовую заяву аб прызнаньні несапраўднасьці Агульнага Схода суполкі, праведзенага 18.12.2004 супрацоўнікамі Радыё «Свабода» як схода, праведзенага з грубымі парушэньнямі Чэскіх законаў і Статута суполкі.

Справа, якая мае рэгістрацыйны нумар 5c9/2005, будзе разглядацца 01.06.2005 у раённым судзе Прага – 7 па вул. Ovocný trh 4 у пакоі 154 у 14:00.

## ЧАЦЬВЕРТЫ ЗЬЕЗД ЗБСБ

У ліпені 2005 г. у Менску адбудзецца IV з'езд беларусаў сьвету, які ладзіць Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Бацькаўшчына». У якасьці дэлегатаў на з'езд ад суполкі «Скарына» вылучаныя Андрэй Рамашэўскі й Рыгор Жыдкоў.

## ПАЗБАЎЛЯЕМСЯ СЬМЕЦЬЦЯ

Радай суполкі «Скарына» 07.05.2005 створана ліквідацыйная камісія па пазбаўленьню ад часткі мэблі, якую перадало суполцы у 2004 г. кіраўніцтва Радыё «Свабода». Старшынёй камісіі прызначаны спадар Гянадзь Кажамяка.

Сяброў суполкі, маючых цікавасьць да наступных рэчаў: сталы кампутарныя (4) й кампутары Macintosh просім звяртацца да спадара Кажамякі па тэлэфоне 777063235.

## СУПОЛКА «СКАРЫНА» У ІНТЭРНЭЦЕ

Афіцыйны сайт суполкі знойдзеце на адрэсе http://www.skaryna.net/, а на http://forum.skaryna.net/ працуе форум адчынены для дыскусіі паміж сябрамі суполкі ды й з іншымі беларусамі. Сябры суполкі вольна карыстаюцца мэйлавымі адрэсамі ў дамэне skaryna.net

## АДЧЫНЕНЫ ЛІСТ

### Сутнасьць г.зв. «канфлікту» унутры суполкі «СКАРЫНА» у Празе

*Адчынены ліст да Старшыні Рады БНР спадарыні Івонкі Сурвілла ад спадара Юркі Станкевіча, сябра Рады суполкі «СКАРЫНА», старшыні Дэмакратычнага Форума беларусаў Эўропы.*

Ужо падчас прыгатовы да Першай сустрэчы беларусаў Эўропы ў Празе (якая адбылася ў жніўні 2004 г.) тагачасная старшыня суполкі спадарыня Ганна Сурмач заскочыла рэшту сяброў Рады суполкі сваімі, можна сказаць, дыктатарскімі паводзінамі – імкнулася праводзіць свае пляны, не узгадняючы іх з рэштай кіраўніцтва, а наадварот, ігнаруючы думкі іншых. Гэта яшчэ ўдалося сяк так перанесьці. Больш да расколу спрычынілася наступнае: 4 сьнежня 2004 г. адбыўся гадавы Агульны й Перавыбарчы Сход суполкі «Скарына» – рэгулярна скліканы, на якім прынялі ўдзел амаль 100% сяброў суполкі, асабіста й праз паўнамоцтвы. Сход прайшоў зусім нармальна, за новага старшыню была абрана спадарыня Іна Паўловіч. Аднак, спадарыня Сурмач, пазнаючы, відаць, што «перамагае» тая група унутры арганізацыі, якая ў мінулым адважылася ёй не падпарадкавацца, й што ня зможа правесьці сваю лінію й сваіх кандыдатаў у кіраўніцтва, проста пакінула сход. Праз два тыдні, 18.12.2004, група працаўнікоў Радыё «Свабода» склікалі свой, быццам Агульны Сход, на якім абвесьцілі Сход 4 сьнежня на падставе розных прыдуманых прычынаў нелегітымным. Проста правялі свайго роду путч, спадзяючыся на тое, што рэшта сяброў суполкі спалохаюцца іхнага «аўтарытэту». Нармальна абранае кіраўніцтва суполкі (у тым ліку і я) апублікавала на сайце суполкі абгрунтаваныя выясьненьні свайго становішча, й прапанавала склікаць адмысловую камісію з удзелам неўтральных асобаў дзеля разгляду канфлікту. На гэтую прапанову дагэтуль ня быў атрыманы адказ. Больш падрабязная інфармацыя аб падзеях 4 і 18 сьнежня 2004 г. пададзена ў двух дадатках:

Заява Рады суполкі з 5 студзеня 2005 г.;

Заява сп-ра Сяргея Скаруліса, сябры Рады суполкі.

Гэтыя дадаткі магу Вам пераслаць у выпадку патрэбы.

***З пашанай – Юрка Станкевіч, сябра Рады суполкі «Скарына».***

ВЫДРА БЕЛАРУСКАЯ - Выданьне Рады Беларускай суполкі ў Чэхіі «Скарына». N3, травень 2005. E-mail: vydra@skaryna.net
Рэдакцыйная калегія: Л.Дзямко, Р.Жыдкоў, Г.Кажамяка, І.Паўловіч, А.Рамашэўскі (рэдактар), С.Скаруліс, Ю.Станкевіч, В.Цімошчанка.
© 2005 Суполка «Скарына». Усе правы абаронены. Перадрукоўка цэлых тэкстаў альбо частак з абавязковай спасылкай на першакрыніцу дазволена.
Пры падрыхтоўцы выданьня была выкарыстана вольнае праграмовае забясьпячэньне - vim, gimp, inskape, scribus пад апэрацыйнай сістэмай Debian Linux